

Польскі Інстытут Мінск

**Калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў**
**Шаноўныя выкладчыкі і студэнты!**

Ад імя Польскага Інстытута ў Мінску сардэчна віншую Вас з 45-годдзем з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Сённяшняя пазіцыя і значэнне ўніверсітэта яскрава сведчаць пра сістэматычнае развіццё і распрацоўку падыходу, які спрыяе вельмі добрай падрыхтоўцы выпускнікоў да патрабаванняў сучаснага рынку працы. Я шчыра спадзяюся, што ўніверсітэцкая супольнасць будзе працягваць ствараць унікальную акадэмічную атмасферу і што, захаваўшы лепшыя традыцыі, на іх будзе будаваць сваю ідэнтычнасць. Я перакананы, што час вучобы стане для многіх студэнтаў самым прыемным перыядам у жыцці, а выпускнікі заўсёды будуць ганарыцца тым, што яны скончылі Універсітэт культуры і мастацтваў.

Віншуючы з дасягненнямі, я жадаю Універсітэту, яго супрацоўнікам, студэнтам і выпускнікам далейшага развіцця і поспехаў. Я веру, што Універсітэт культуры і мастацтваў захавае сваю высокую адукацыйную і навуковую пазіцыю на карысць Мінска, Беларусі і ўсёй беларускай культуры і створыць новыя выдатныя і прыгожыя старонкі сваёй гісторыі.

Я хачу падзякаваць за плённае супрацоўніцтва і рэалізаваныя сумесна з Польскім Інстытутам у Мінску праекты. Я ўпэўнены, што і ў далейшым сумесная праца будзе спрыяць узаемаразуменню двух нашых народаў, аб'яднаных стагоддзямі агульнай гісторыі і культуры, і развіццю польска-беларускіх сувязей.

Шчыра жадаю кіраўніцтву і ўсяму калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў моцнага здароўя і дабрабыту, а таксама творчых поспехаў і дынамічнага развіцця.

Дырэктар Польскага Інстытута ў Мінску
Цэзары Карпіньскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ